УДК 811.161.3
**КУЗЬМІЧ Л.Р.,** студэнт
Навуковы кіраўнік – **Баушына Ю.У.,** ст. выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЯЕ МЕСЦА Ў СІСТЭМЕ АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

**Уводзіны.** Нацыянальная мова – гэта адметная рыса любой нацыі. Без нацыянальнай мовы нацыя існаваць не можа. Беларуская нацыянальная мова – гэта мова беларускага народа, яго скарб, які непадзельна звязаны з духоўнай сутнасцю беларускага народа. Усе асаблівасці жыцця, гісторыя і грамадскі вопыт, маральныя і этычныя каштоўнасці народа адлюстраваны ў яго нацыянальнай мове.

**Матэрыялы і метады даследаванняў.** Мы вывучылі пэўную колькасць гістарычнай літаратуры па тэме, вызначылі асноўныя формы беларускай літаратурнай мовы, акрэслілі месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў. Выкарыстоўваліся наступныя метады: апісальны, лінгвакультуралагічны, параўнальна-супастаўляльны.

**Вынікі даследаванняў.** Словы сучаснай беларускай мовы вельмі розныя паводле часу ўзнікнення і паходжання. Аснову лексікі сучаснай беларускай мовы складаюць словы спрадвечна беларускія, да якіх адносяцца: 1) словы, якія беларуская лексіка захавала яшчэ з перыяду агульнаславянскага моўнага адзінства; 2) словы, якія належаць да ўсходнеславянскай мовы – агульнай моўнай крыніцы ўсходніх славян; 3) словы ўласнабеларускія, што ўзніклі ў эпоху самастойнага існавання ўсходнеславянскіх моў.

Беларуская мова належыць да славянскіх моў, якія ўтвараюць тры групы: а) усходнеславянскую (беларуская, руская, украінская мовы); б) заходнеславянскую (польская, чэшская, славацкая, верхнялужыцкая, ніжнялужыцкая мовы); в) паўднёваславянскую (балгарская, сербская, харвацкая, македонская, славенская, баснійская, чарнагорская мовы). Гэтыя тры славянскія моўныя групы склаліся гістарычна: назвы адпавядаюць геаграфічнаму размяшчэнню – тэрыторыі, якую засяляюць носьбіты гэтых моў. Славянскія моўныя групы падзяляюцца на аснове агульных асаблівасцей, уласцівых мовам, што ўтвараюць пэўную групу. Адзін славянін без цяжкасці або з пэўнай цяжкасцю разумее другога нават без спецыяльнай адукацыі, вучонасці. Ва ўсіх славянскіх мовах ёсць вялікі пласт лексікі, якую называюць агульнаславянскай. Гэта словы, што былі яшчэ ў далёкі дапісьмовы час у так званай агульнаславянскай мове-аснове.

Нацыянальная мова беларускага народа складаецца з літаратурнай і народна-дыялектнай мовы. Літаратурная мова – гэта ўнармаваная, апрацаваная майстрамі слова і дзеячамі культуры мовы, вышэйшая форма нацыянальнай мовы, якая абслугоўвае ўсе сферы жыцця і дзейнасці людзей. Менавіта яна служыць агульнанародным сродкам моўных зносін і пашырана на ўсёй тэрыторыі Беларусі. На літаратурнай мове ствараецца мастацкая літаратура, друкуюцца газеты, часопісы, вяшчаюць радыё, тэлебачанне, працуюць тэатры, вядзецца навучанне ў школах, ВНУ.

Народна-дыялектная мова – гэта мова народа, якая выступае ў выглядзе мясцовых гаворак. Гаворка – гэта мова пэўнай мясцовасці, аднаго ці некалькіх населеных пунктаў з аднатыпнымі моўнымі рысамі. Дыялектная мова, мясцовыя гаворкі адрозніваюцца ад літаратурнай сваёй неаднастайнасцю і абмежаванасцю пашырэння асобных моўных рыс, вуснай формай. Гэта гутарковая, бесьпісьмовая мова, якая пераважна ўжываецца ў сельскай мясцовасці. Беларуская дыялектная мова з’яўляецца сродкам узбагачэння літаратурнай мовы. Сучасная беларуская літаратурная мова грунтуецца на гаворках цэнтральнай часткі Беларусі.

Мова існуе ў дзвюх разнавіднасцях: вуснай і пісьмовай. Кожная з гэтых дзвюх форм мае сваю сферу выкарыстання. Вуснай карыстаюцца пры непасрэдных моўных кантактах. Гэта мова, радыё, тэлебачання, дакладаў, выступленняў і г. д. Пісьмовая мова выкарыстоўваецца ў перыядычным друку, справаводстве, мастацкай літаратуры, навуковых

працах. Дзякуючы пісьменству мы ведаем пра гістарычных дзеячаў мінуўшчыны, іх справы: князёў Алега, Ігара, Яраслава Мудрага; асветнікаў Е. Полацкую, К. Тураўскага, Ф. Скарыну, С. Полацкага, ведаем творы пісьменнікаў XIX стагоддзя – В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча [1].

Вусная мова – найважнейшая форма існавання і рэалізацыі граматычнага ладу і лексіка-фразеалагічнага моўнага запасу, інакш кажучы, гэта гаварэнне ці маўленне. Вуснае маўленне характарызуецца багаццем інтанацыйных магчымасцей, мелодыкай, лагічным націскам, выразнасцю жывога гучання, наяунасцю паўз.

Зорныя часы культурнай творчасці ў гісторыі народа названы эпохамі культурна-нацыянальнага Адраджэння, якое пачыналася заўсёды з абвяшчэння роднай мовы першай духоўнай каштоўнасцю. З асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны, яго перакладу на родную мову Бібліі (1517-1519 гг.) пачаўся адлік гадоў першага беларускага народнага Адраджэння ў эпоху Еўрапейскага Рэнесансу. Выдатныя дзеячы беларускай культуры XVI-XVII ст. (П. Мсціславец, С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, А. Філіповіч, С. Полацкі) былі прадаўжальнікамі спадчыны першадрукара. Другое беларускае Адраджэнне пачалося ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя з паступовага вяртання да літаратурнага жыцця беларускай мовы. Выходзяць ананімныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Пачынаецца творчая дзейнасць Яна Чачота, Ф. Багушэвіча, В. Дунін-Марцінкевіча, У. Сыракомлі, Яна Баршчэўскага і інш. Новы этап беларускага нацыяльнага Адраджэння пачаўся пасля 1905 года і найважнейшае яго дасягненне – стварэнне беларускай класічнай літаратуры. Яна была вынікам творчасці Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча [2].

**Заключэнне.** Сучасныя славянскія мовы блізкія паміж сабой, роднасныя. Ва ўсіх славянскіх мовах ёсць шмат падобнага. Граматычны лад агульны. Усе яны уваходзяць у адну роднасную групу славянскіх моў. Пра агульнасць паходжання гэтых моў сведчыць вялікая колькасць аднакарэнных слоў. Славянскія мовы маюць шмат агульнага не толькі ў лексіцы, але і ў фанетыцы, і ў граматыцы. Увогуле, даследчыкі лічаць, што беларуская мова з'яўляецца ключом да разумення заходнеславянскіх і паўднёваславянскіх моў [3].

***Літаратура.*** *1. Плотнікаў, Б. А., Антанюк, Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс. Кніжны Дом, 2003. – С. 52-68. 2. Беларуская мова: энцыклапедыя / пад рэдакцыяй А. Я. Міхневіча. – Мінск, 1995. – 653 с. 3. Сачанка, Б. І. Беларусь: энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка і інш. – Мінск, 1995. – 800 с.*

УДК 94 (467) “1941-1945”
**ЛУКАШИК П.А.,** студент
Научный руководитель – **Виноградов И.А.,** канд. филол. наук, доцент
УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины», г. Витебск, Республика Беларусь

## РОЛЬ МОНУМЕНТОВ В СОХРАНЕНИИ ПАМЯТИ О ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ

**Введение.** Великая Отечественная война (1941-1945 гг.) оставила глубокий след в истории и памяти поколений. Сохранение памяти о войне, героизме и жертвах советского народа является важной задачей современного общества. Памятники, посвященные героям Великой Отечественной войны, являются частью экскурсий, местом почитания погибших**,** вечным напоминанием о героической победе.

**Материалы и методы исследований.** Материалом исследования являются памятники и мемориальные комплексы Республики Беларусь, связанные с тематикой Великой Отечественной войны, государственные патриотические акции и социальные опросы. Метод исследования, который был использован в нашей работе, – сравнительный анализ.

**Результаты исследований.** Монументы и мемориальные комплексы, посвященные